Лоўчава А. К., студ. гр. 138 ФІДК
БГУ культуры і мастацтваў.
Навуковы кіраўнік – Тычко Г.К.,
докт. філал. навук, прафесар

# ВАСІЛЬ ГАРБАЦЭВІЧ “ЧЫРВОНЫЯ КВЕТКІ БЕЛАРУСІ”

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У сваёй працы мне хацелася б паведаміць пра Васіля Савіча Гарбацэвіча. Яго імя не так часта можна сустрэць у літаратуры, але ён зрабіў вялікі ўклад у развіццё беларускай драматургіі.

Таксама гэта імя для мяне дарага тым, што ён мой прапрадзед. Таму дазвольце мне расказаць пра чалавека, які праз усё сваё жыццё пранёс любоў да сваёй роднай вескі, да людзей, з якімі жыў і працаваў, да сваей радзімы. Яшчэ раз успомніць імя Васіля Савіча Гарбацэвіча і ўшанаваць яго памяць.

Ён нарадзіўся ў 1983 годзе ў прыгожай вёсцы Дукора, якая і зараз знаходзіцца ў Пухавіцкім раёне Мінскай вобласці. Лес, рака Свіслач, луг, бязмежныя палі – цудоўны куток Беларусі.

Ужо з шасці гадоў хлапчук пасвіў цялят. За лета ён зжываўся з лесам, ракой, лугам, што нават і не мог уявіць сябе без іх. Праз усё жыццё родная прырода была самым блізкім яго сябрам. Васіль заўсёды быў зачараваны фальклорам: народнымі песнямі, казкамі, абрадамі і звычаямі. Асабліва яму падабалася, як спяваюць жанчыны падчас сенакосу або падчас жніва.

Чытаць пачаў у 1900 годзе. І навучыўся чытаць не ў школе, за партай, а на каленях сваёй маці. Яна, калі ўправіцца з гаспадаркай, пачынала чытаць. І Васіль прасіў яе чытаць уголас. Яму гэта вельмі падабалася, а пасля старэйшая сястра паказала яму літары і ён пачаў чытаць ужо сам.

У школе настаўнік адразу пасадзіў яго ў другую групу. Часта Васіля пасылалі да першакоў праверыць, ці вывучылі яны дома ўрокі. І яму гэта вельмі

падабалася. Можа, гэта і адыграла некаторую ролю ў тым, што потым ён абраў сабе прафесію педагога.

Любоў да роднага мастацкага слова Васіль адчуў, калі яму было дзесяць гадоў.

Яго брат, Лукаш, вычыўся ў Насвіжскай настаўніцкай семінарыі. Там жа атрымліваў адукацыю і Якуб Колас. Маладыя настаўнікі часта перапісваліся. І аднойчы ўлетку Якуб Колас запрасіў яго прыехаць да сябе. І вось, калі брата не было дома, Васіля пацягнула да яго кніг і сшыткаў. Там, у “Запісках паляўнічага”, знайшоў такое пісьмо:

Мой ты родненькі Лукашу,
Прыязджай ка мне на кашу,
У нас завуць яе куцця,
Пад’ясі – ну і дасць жыцця.
Кажу табе я, мой ты брат:
Пацягне раптам да дзяўчат,
Адчуеш спевы салаўя.
Пішу табе ўсё гэта Я…

Паглядзеўшы на подпіс, Васіль Гарбацэвіч зразумеў, што верш быў напісаны Кастусём Міцкевічам. Ён знайшоў яшчэ восем лістоў ад Коласа. Васіль бярог іх да самай вайны. Але ў 1943 годзе фашысты спалілі Дукору. У часе пажару загінулі і лісты Якуба Коласа.

З 1909 года па 1913 год Васіль Савіч навучаўся ў Рагачоўскай настаўніцкай семінарыі. Але… ён спрабаваў нават быць урачом. Паступіў і навучаўся адзін ці два гады ў Медыцынскім універсітэце ў Мінску. Калі павінна была быць практыка, іх вазілі ў морг, як і ўсіх студэнтаў гэтага ўніверсітэта. Ён не вытрымаў такога выпрабавання і пакінуў навучальную ўстанову.

Пасля заканчэння Рагачоўскай настаўніцкай семінарыі Васіль Гарбацэвіч працаваў у Лютаўскай земскай школе. Чытаў мастацкую літаратуру.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Два гады ў Лютых для яго праляцелі вельмі хутка. За гэты час яго вельмі захапіла педагагічная праца, ён вельмі палюбіў дзяцей. Але ў яго было моцнае жаданне вучыцца далей. Ён паступіў у Мінскі настаўніцкі інстытут.

Калі наблізіўся фронт, інстытут быў эвакуіраваны ў Яраслаўль. На вечарах у інстытуце выступаў Максім Багдановіч, які ў той час з'яўляўся студэнтам юрыдычнага ліцэя. Ён пазнаёміўся з Гарбацэвічам. Яны сустракаліся і ўспаміналі сваю родную Беларусь, па якой асабліва сумаваў Максім Адамавіч Багдановіч.

Пра адну такую сустрэчу і літаратурны вечар з удзелам Багдановіча і напісаў Васіль Гарбацэвіч амаль з дакументальнай дакладнасцю драматычны абразок, які быў названы "Яраслаўскі вечар".

У 1918 годзе Васіль Савіч скончыў настаўніцкі інстытут і прыехаў у Дукору, якая ў той час знаходзілася яшчэ пад акупацыяй. Але потым, калі акупантаў прагналі, дукорцы вырашылі на свае сродкі адкрыць вышэйшую пачатковую школу. Таму 1918 год можна лічыць пачаткам яго педагагічнай работы ў Дукоры.

Не паспелі жыхары вёскі агледзецца, нарадавацца таму, што нямецкія акупанты былі прагнаны, як насунулася польская акупацыя. Пачалася бязлітасная барацьба з ворагам.

На вачах Васіля Гарбацэвіча шаснаццаць дукорскіх партызанаў-падпольшчыкаў былі расстраляны белапалякамі. Такое немагчыма было забыць…таму ён піша драму – першую гераічную драму ў беларускай савецкай драматургіі – аб беларускіх партызанах – "Чырвоныя кветкі Беларусі".

У 1923 годзе п'еса была надрукавана ў "Полымі". Таксама ставілася яна на сцэне беларускага дзяржаўнага тэатра.

У той час узнікалі атрады народных мсціўцаў. Адзін з іх існаваў у Дукорскай пушчы. Арганізаваў яго Блажко Андрэй. Але не давялося атраду поўнасцю

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

разгарнуць свае дзеянні. Знайшоўся здраднік, які выдаў партызан. Адзінаццаць з іх акупанты расстралялі ў пушчы.

Васіль Савіч быў асабіста знаёмы з адным з гэтых партызанаў – Міхасём Рудовічам. Таму, калі яго твор ставіўся ў Мар’інагорскім сельгастэхнікуме, студэнты запрасілі Гарбацэвіча прысутнічаць як аўтара, як чалавека, які ведаў шмат каго з гэтых партызан, асабліва Рудовіча, які быў расстраляны белапалякамі.

У 1924 годзе Васіля Савіча прызначылі выкладчыкам у Магілёўскі педагагічны тэхнікум. Праз год да родных у Магілёў прыехаў Міхась Зарэцкі. Ён прапанаваў арганізаваць філію “Маладняка”. Так і зрабілі. Кіраўніком быў абраны Гарбацэвіч. Філія праіснавала два гады. Затым яе члены раз’ехаліся. І ў 1929 годзе Васіль Савіч вяртаецца ў Мінск вучыцца.

У 1933 годзе апынуўся ў сваёй роднай Дукоры, зноў працаваў у любімай школе. Дзеці і моладзь з’яўляліся яго стыхіяй.

Са школай ён не губляў сувязі, нават калі і не працаваў ужо. Бываў на педсаветах, рабіў для настаўнікаў і для вучняў старэйшых класаў даклады аб эстэтычным выхаванні, выступаў на зборах піянерскай дружыны, на камсамольскіх сходах. І ўдзельнічаў у мастацкай самадзейнасці. Дваццаць шэсць настаўнікаў з трыццаці шасці – былыя вучні Васіля Савіча.

У апошнія гады жыцця ён яшчэ патроху пісаў, але была ў яго адна бяда: зусім здавала правая рука – вынік кантузіі пры вайне. Памёр ён у дзевяноста тры гады і быў пахаваны ў Дукоры.

Васіль Савіч Гарбацэвіч узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга і медалямі. З’яўляецца заслужаным настаўнікам БССР.

П’есы Васіля Гарбацэвіча – першыя старонкі маладой беларускай савецкай драматургіі. Гэта наша гісторыя, і яе трэба шанаваць. Перадаваць яе з пакалення ў пакаленне сваім нашчадкам.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Спіс выкарыстаннай літаратуры:

1. “Гісторыя беларускай літаратуры XX ст. 1902 - 1920гг.” Том 1, “Беларуская навука” Мн., 2003г
2. В. С. Гарбацэвіч “Чырвоныя кветкі Беларусі”, “Мастацкая літаратура”, Мн., 1983г.
3. А. К. Гарадзіцкі “Пісьменнікі савецкай Беларусі”, “Мастацкая літаратура”, Мн., 1981г.
4. Аўтабіяграфія беларускіх пісьменнікаў “Вытокі песні”, “Мастацкая літаратура”, Мн., 1973г.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ